# Мастер лозоплетения из Шерешево делится секретами своего творчества (http://www.budni.by/?p=7485)

*Вторник, 10.12.2013 15:41. Рубрика: Актуально, Творчество.   Просмотров: 1 586*

Марына Вакульская, Аляксандр Мелеш (фота)

Лазапляценне — адно са старэйшых чалавечых рамёстваў, якое ўзнікла нават раней, чым метала-   і дрэваапрацоўка. Дарэчы, адзінае, якое дайшло да нашых дзён амаль што ў сваім першародным выглядзе. Праўда, сёння майстроў лазапляцення можна пералічыць на пальцах. Адзін з нямногіх — жыхар Шарашова В.С.Хеншаль.

Пра тое, што ў сям'і Хеншаляў ёсць майстар лазапляцення, можна здагадацца, яшчэ толькі пераступіўшы парог іхняй хаты. Утульнасці ўнутранаму ўбранню дома ў першую чаргу надаюць самабытныя вырабы: вышыўка, чучалы птушак. Але асабліва многа плеценых абажураў, кашолак, рамак для люстэркаў і фота, вазачак, пано — усё гэта вынік карпатлівай працы галавы сям'і.

Лазапляценнем, як  прызнаецца сам Валерый Станіслававіч, ён займаецца каля 15 гадоў. А пачынаў  асвойваць справу па кніжках і часопісах.



— Усё жыццё працаваў пчаляром, — расказвае майстар, — і  толькі тры гады давялося быць загадчыкам школьнай гаспадаркі. Але менавіта ў гэты перыяд па іроніі лёсу я атрымаў штуршок да занятку лазапляценнем: кіраўніцтва школы папрасіла на мітынг да 9 Мая знайсці кашолку для кветак. Вырашыў зрабіць яе сам. Праўда, як у прыказцы, першы блін выйшаў камяком. Каб людзі не засмяялі, кашолку тую спаліў.

Затым была другая, трэцяя... У выніку сёння Валерый Станіслававіч ужо і збіўся з ліку сваіх плеценых работ. Калі кашолкі толькі ўвайшлі ў моду, Хеншаль, які ўжо па-майстарску сплятаў лазу да лазы, толькі за адну зіму зрабіў іх амаль 20 штук.

Хочацца адзначыць, што лазапляценне — занятак, падуладны толькі людзям цярплівым і ўседлівым. Валерый Станіслававіч з веданнем расказвае пра нюансы. Нарыхтоўваць лазу, напрыклад, трэба позняй восенню — зімой, калі кусты ўжо скінулі лісце і яшчэ не пачаўся рух соку ў расліне: лаза вышэйшай якасці толькі з добра выспелай драўніны. Затым пруткі неабходна як след выварыць, пакуль не пачне злазіць кара. Са шматгадовым вопытам Хеншалем былі назапашаны і некаторыя хітрасці. Так, Валерый Станіслававіч раіць навічкам варыць лазу ў чыгуне пад гнётам — больш зручна: туды і пруткоў больш улазіць, і,  дзякуючы круглай форме посуду, яны не «вылазяць». Затым вывараную і пакараваную лазу сартуюць і добра высушваюць. Дарэчы, для пляцення могуць аказацца прыдатнымі не ўсе пруткі: кожны неабходна праверыць на ломкасць.

— Каб лаза была аднаго гатунку, справа ішла б спарней, — гаворыць мужчына. — Я нават спрабаваў сам вырошчваць лазу, але, відаць, глеба не падышла: культура не стала развівацца і ў рэшце рэшт загінула.

У дзень, калі збіраешся сядаць за справу, лазу ізноў трэба добра намочваць, каб яна набыла неабходную гнуткасць. Яшчэ немалаважны нюанс, які і вылучае лазапляценне з ліку іншых майстэрстваў, — калі пачаў работу, яе трэба закончыць у той жа дзень. Таму іншы раз работу над сваімі вырабамі Валерый Станіслававіч заканчвае ў дзве-тры гадзіны ночы.

— Увогуле, не люблю плесці адное і тое ж. Куды больш цікавей рабіць адну рэч, але па-рознаму: калі гэта кашолкі, то, напрыклад, рознай формы, з загібкамі.

Між іншым, не магу не  адзначыць, што Валерый Станіслававіч — чалавек з featureрознабаковымі захапленнямі. Пра адно з іх нескладана здагадацца, зайшоўшы на падворак і ўбачыўшы галубятню.

— Люблю разнастайнасць, таму ўсе пароды галубоў, што трымаю, толькі па пары, — паказвае пярнатых гадаванцаў мужчына.

А дзіцячае непадробнае захапленне прыгажосцю сіваваронак, якіх плойма гняздзілася непадалёку бацькоўскай хаты, з часам перарасло ва ўменне рабіць чучалы птушак. Сам Валерый Станіслававіч успамінае:

— На палях патраву рабілі, дык птушкі загінулі і цалкам выveліся. Я, хлапчук, знайшоў адну, але спроба зрабіць яе чучала не ўдалася. Крыху пазней дапамагчы ў гэтым па-прасіў знаёмы. Паступова атрымаў пэўны вопыт...

У хаце ў палёце, расправіўшы крылы, застылі ястрабы. Некалькі птушак сёння знаходзяцца ў кабінеце біялогіі мясцовай Шарашоўскай школы.

А вось захапленне пчалярствам у свой час перарасло ў прафесійны занятак, які яго корміць вось ужо каля 30 гадоў.

— У нас дома кніга была накшталт кіраўніцтва па пчалярстве. Дык я яе так зачытаў, што родзіч мой вырашыў мне адзін вулей падарыць. Праўда, атрымалася гэта вельмі знянацку: прыехаў, вулей выгрузіў і, не папярэдзіўшы, развітаўся. Толькі на наступны дзень я заўважыў «падарунак». Варта прызнацца, што пчалярствам я цікавіўся, але пчол баяўся, як агню. Але што заставалася рабіць у гэтай сітуацыі? Захапіўшыся, вырашыў нават паступаць у вучылішча на пчаляра.

Цяпер у Хеншаля больш сотні вулляў: 12 — сваіх, 90 — «Райаграсэрвіса», дзе ён працуе пчаляром трэць стагоддзя.

Валерый Станіслававіч падводзіць вынік нашай сустрэчы:

— Цікаўнаму чалавеку ніколі не будзе сумна: галоўнае — знайсці занятак па душы.